# КАЛІ ЗАКОНЧЫЎСЯ ЎРОК

*З вопыту работы*

## “І ВЕЕ ВЕРШ МОЙ ДЗІЎНАЙ КАЗКАЙ…”

### СЦЭНАР ПАСЯДЖЭННЯ КЛУБА “КЛАСІКІ І СУЧАСНІКІ”

**Мэты:** пазнаёміць з жыццём і творчасцю Максіма Багдановіча; фарміраваць уменне даваць ацэнку лірычнаму твору; выпрацоўваць навыкі выразнага чытання вершаў; спрыяць выхаванню мастацкага густу, цікавасці да нацыянальнай культуры, да асобы паэта, яго творчасці; развіваць творчыя здольнасці навучэнцаў.

**Абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя, мультымедыйны праектар для дэманстрацыі слайдаў, выстава кніг пра творчасць Максіма Багдановіча.

#### ХОД МЕРАПРЫЕМСТВА

**1-ы вядучы.** Паважаныя госці! Пасяджэнне клуба прысвечана творчасці аднаго самых загадкавых беларускіх паэтаў – Максіма Багдановіча (*слайд 1*)*.

Споўнілася сто гадоў, як памёр паэт. І ўжо сто гадоў існуе галіна ведаў – багдановічазнаўства, якая вывучае біяграфію, творчасць паэта, яго спадчыну як літаратурнага крытыка, уплывы на развіццё беларускай паэзіі. У багдановічазнаўстве вылучаюцца філасофскі, бібліяграфічны, гістарыяграфічны, мовазнаўчы, мастацтвазнаўчы аспекты.

Вы, хто любіце натрапіць
Між страніц старых, пажоўклых
Кнігі, ўжо даўно забытай,
Блеклы, высахшы лісток, –
Праглядзіце гэты томік:
Засушыў я на паперы
Краскі, свежыя калісьці,
Думак шчырых і чуцця.

**2-і вядучы.** Паэзія па сваёй прыродзе была і застаецца загадкай. Разгадвае яе кожны ўласным сэрцам. Паспрабуем разгадаць загадку Багдановіча.

І першая загадка – як, якімі шляхамі спасціг паэт родную мову, бо быў адарваны ад яе каранёў, выхоўваўся ў рускамоўным асяроддзі (*слайды 2 – 4*).

Магчыма, вывучыў родную мову па фальклорных запісах, што захаваліся ў бібліятэцы Адама Ягоравіча, бацькі паэта. Адам Ягоравіч, па прафесіі настаўнік, у маладосці вывучаў этнаграфію, фальклор, гісторыю, запісаў ад сваёй бабкі вялікую колькасць народных казак і песень (*слайд 5*).

**1-ы вядучы.** Магчыма, музыка роднай мовы запала ў душу маленькага Максіма, калі ён разам з маці Марыяй Апанасаўнай жыў у цёткі ў вёсцы Вяззе Асіповіцкага раёна (*слайд 6*).

Зразумела, што захапленне роднай мовай падтрымала ў Максіма яго хросная Вольга Епіфанаўна Сёмава, якая выпісала ў 1906 г. у далёкі ад Беларусі Ніжні Ноўгарад газету “Наша Ніва”, што выдавалася ў Вільні. У гэтым выданні з’явіўся першы друкаваны твор Максіма Багдановіча – апавяданне “Музыка” (*слайд 7*).

**2-і вядучы.** Другая загадка – паэтычная: маючы адзіны прыжыццёвы зборнік “Вянок”, паэт стаў класікам беларускай літаратуры.

Далёка ад Радзімы і роднай мовы Максім Багдановіч абраў Радзіму і мову. Магчыма, яго паклікаў час – пачатак дваццатага стагоддзя – час беларускага адраджэння, перыяд паскоранага развіцця беларускай літаратуры. Ён тварыў побач з волатамі беларускай літаратуры Якубам Коласам, Янкам Купалам, Максімам Гарэцкім (*слайд 8*).

• ***Выразнае чытанне верша*** *“Кінь вечны плач свой аб старонцы…”.*

**1-ы вядучы.** Калі гаварыць пра творчасць паэта, то шмат разоў даводзіцца паўтарыць слова *ўпершыню*.

Упершыню ў беларускай паэзіі Максім Багдановіч выкарыстаў вобразы беларускай міфалогіі: Вадзяніка, Лесуна, Змяінага цара.

Упершыню звярнуўся да класічных формаў верша: трыялет, санет, рандо.

Максім-кніжнік (так яго называлі сябры) адзін з першых творча пераасэнсаваў здабыткі сусветнай паэзіі і стаў перакладаць еўрапейскіх паэтаў на беларускую мову, гэтым самым выдатна даказаў, што мова яго продкаў цудоўна распрацаваная.

* Пры падрыхтоўцы мультымедыйнай прэзентацыі выкарыстаны матэрыялы выдання “Паэт красы і гармоніі”[3].

Паэзія Багдановіча надзвычай меладычная, спеўная. Нездарма да яго творчасці звярталіся і звяртаюцца многія кампазітары.

• ***Праслухоўванне "Эмігранцкай песні"*** *(верш М. Багдановіча, муз. У. Мулявіна) у выкананні ансамбля "Песняры" (слайд 9).*

**2-і вядучы.** І шмат яшчэ што ён зрабіў упершыню для беларускай літаратуры, для абуджэння любві беларусаў да роднай мовы, спадчыны, бо сам горача любіў Беларусь.

Нарадзіўся паэт 9 снежня 1891 года ў Мінску ў сям'і настаўнікаў. Марыя Апанасаўна, маці Максіма, скончыла ў Мінску жаночае Аляксандраўскае вучылішча, вучылася ў жаночай настаўніцкай школе ў Пецярбургу. Адам Ягоравіч скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Шмат займаўся самаадукацыяй. Працаваў выкладчыкам, служыў у банку. Гісторык, этнограф, фалькларыст (*слайд 10*).

У 1892 г. сям'я пераехала ў Гродна, дзе прайшлі дзіцячыя гады паэта (*слайды 11, 12*). У 1895 г. Марыя Апанасаўна разам з дзецьмі гасцявала ў сваёй сястры ў вёсцы Вяззе Асіповіцкага раёна, дзе Максім упершыню адчуў прыгажосць беларускай мовы. У сям'і гаварылі па-руску (*слайд 13*).

**1-ы вядучы.** Калі Максіму было 5 гадоў, памерла маці, Багдановічы пераехалі ў Ніжні Ноўгарад (*слайд 14*). У 1902 г. Максім паступіў у Ніжагародскую гімназію. У 1908 г. Адама Ягоравіча пераводзяць у Яраслаўль, дзе Максім працягвае навучанне (*слайд 15*).

Летам 1911 г. Максім адпачываў у вёсцы Ракуцёўшчына Маладзечанскага раёна (*слайд16*). У тым жа годзе ён паступіў у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй.

У пачатку 1914 г. у друкарні Марціна Кухты ў Вільні выходзіць зборнік вершаў "Вянок" (*слайд 17*). Закончыўшы ліцэй у 1916 г., Максім Багдановіч едзе ў Мінск, жыве ў доме Змітрака Бядулі (*слайд 18*).

У лютым 1917 г. цяжка хворы паэт выехаў на лячэнне ў Ялту, дзе 25 мая памёр ад спадчыннай хваробы – сухотаў. Там жа і пахаваны (*слайды 19, 20*).

Ў краіне светлай, дзе я ўміраю,
У белым доме ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты.

**2-і вядучы.** З успамінаў Адама Ягоравіча Багдановіча, бацькі паэта: "Так много рокового в его безвременно угасшей жизни, что невольно приходит на память образ древней Мойры, которая была к нему исключительно безжалостной и грубо насмеялась над всеми его мечтами и надеждами… Даже скромная надежда умереть в родной земле и та была обманута. И какая несуразность, что не он обо мне, а я о нем должен писать свои воспоминания" (*слайд 21*).

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Даўно ўжо цэлам я хварэю…".*

**1-ы вядучы.** З успамінаў Адама Ягоравіча Багдановіча: "Необыкновенная живость восприятия, чувства и движений была основной выдающейся чертой натуры Марии Афанасьевны. Подвижная, всегда весёлая, с искристыми глазами, с косой чудовищной величины, она вдобавок обладала грацией котёнка и той неотразимо чарующей прелестью, которую принято называть женственностью.

Её карточки не дают никакого понятия не только о её духовном облике, но даже о внешнем. Это – маска, лишённая жизни; а она была вся сверкающая, поющая жизнь, вся движение, радость, восторг…" (*слайд 22*).

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Жывеш не вечна, чалавек…".*

**2-і вядучы.** З успамінаў Адама Ягоравіча Багдановіча: "По складу своего характера, мягкого и женственного, по весёлости своего нрава, живости, отзывчивости и впечатлительности, по полноте и мягкости наблюдений, по силе воображения, пластичности и вместе живописности продуктов его творчества он [Максим] всего более напоминал свою мать, особенно в детстве…

…по моему мнению, его поэтический талант есть дар его матери, в ней самой дремавший в неразвитом состоянии, или, может быть, осколок поэтического дарования его прабабушки Рузали, сказкам которой в моих записях и песням своей родины он обязан пробуждением своего таланта".

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Прывет табе, жыццё на волі!..".*

**1-ы вядучы.** З успамінаў Адама Ягоравіча Багдановіча: "Первоначальное обучение со всеми детьми, в том числе и с Максимом, я вел сам, а по поступлению в гимназию руководил их самостоятельным чтением… В моей библиотеке было всё, что было лучшего в мире и ничего пошлого – значит выбор был обширный и на все вкусы… Дома Максим учился охотно и легко…" (*слайд 23*).

**2-і вядучы.** З успамінаў Адама Ягоравіча Багдановіча: «По этим сказкам [бабки Рузали Казимировны] Максим ознакомился впервые с белорусской речью. Она знала на память множество белорусских песен и вообще была носительницей и хранительницей народной старины: обрядов, гаданий, пословиц, народных лекарственных средств… Кое-что позаимствованное мною из этого источника через посредство моих писаний отразилось на творчестве её правну-

ка Максима, своеобразно им претворенная, в особенности в цикле "У зачараваным царстве" (*слайд 24*).

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Добрай ночы, зара-заранiца!..".*

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Па-над белым пухам вiшняў…".*

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Плакала лета…".*

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Зiмой".*

**1-ы вядучы.** З успамiнаў Адама Ягоравiча Багдановiча: "С тем же упорством он относился и к изучению белорусского языка и к написанию стихов на нём. Если принять к соображению состояния его здоровья, необходимость ученья и все обстоятельства его жизни, то нельзя не признать его работу в этой сфере огромной. Ведь не пошёл же он по линии наименьшего сопротивления: не стал писать по-русски. Но он этот лёгкий путь еще в детстве отверг и смело решил преодолеть огромные трудности, чтобы овладеть родной речью своих предков и овладеть настолько, чтобы писать красивые стихи и обогатить эту речь новыми художественными формами. К последней цели он стремился вполне сознательно.

Ему хотелось показать, что никакой размер, никакая форма не чужды белорусской речи. Какие трудности он преодолел на этом пути, свидетельствуют его рукописи и тетради: сколько там выписок из словарей, сборников и старопечатных книг!"

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Санет" ("Памiж пяскоў егiпецкай зямлi…").*

**2-і вядучы.** З успамiнаў Адама Ягоравiча Багдановiча: «В "Нашей Ниве" впервые появились в печати его стихи, не помню, в 1906 или 1907 году. Но ясно помню его радость в лице и сверкавшие живым огоньком глаза, когда он, вбежав в мою комнату, показывал мне напечатанными свои стихи… Понятна эта радость. Тут не только говорило самолюбие, столь свойственное молодости, видеть своё имя в печати, но и нечто большее: сознание, что подготовительные труды были не бесцельны, что он, оторванный от родины, заговорил её языком, хотя и не совсем чистым, пусть даже и картавым, но это дело всё исправляющего времени, а пока есть куда притулиться и дать исход накопившимся чувствам и смутным мечтам о далёкой таинственной родине: гукнуть издалека – и услышать созвучный отклик» (*слайд 25*).

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Песняру".*

**1-ы вядучы.** З успамiнаў Адама Ягоравiча Багдановiча: «Его тянуло в Белоруссию, где ему хотелось познакомиться с белорусскими писателями и деятелями по белорусскому возрождению… Я, разумеется, ничего против этого не имел, и он отправился в Вильно в половине июня (1911) тотчас же по выходе из гимназии. Поездка длилась два месяца с небольшим и обогатила его живыми наблюдениями родного края, вообще поставила лицом к лицу с живой действительностью…

Поездкой он был очень доволен, и, конечно, она была весьма благотворна для его поэтической деятельности. Возвратясь, он легко рассказывал о подвижниках белорусской литературы, о тех злоключениях, которые они переживают, о недостатках средств, о бескорыстном служении родному слову многих работников, главным образом из среды учителей… о Вильне и её старине… о виленском музее древностей… о коллекции слуцких поясов, которые он там видел и которые, по-видимому, вдохновили его к написанию "Слуцких ткачих"» (*слайд 26*).

• ***Выразнае чытанне*** *верша "Слуцкiя ткачыхi".*

• ***Праслухоўванне песнi "Слуцкiя ткачыхi"*** *(верш М. Багдановiча, муз. У. Мулявiна) у выкананнi ансамбля "Песняры" (слайд 27).*

**2-і вядучы.** З успамiнаў Адама Ягоравiча Багдановiча: «Я никогда его не видел в женском обществе, за исключением его двоюродных сестёр. Думаю, что он никогда его и не искал. Он слишком был серьёзен и чист для фривольных связей и слишком честен, чтобы вводить кого-нибудь в заблуждение насчёт серьёзности своих намерений, а о женитьбе он, видимо, не помышлял ввиду своей болезни.

Насколько возвышенны были его взгляды на женщину, свидетельствует вся его поэзия… "Мадонна" – вот тот образ и тот идеал, в котором он представлял себе женщину – образ чистоты и невинности…

И потому, рисуя образ Мадонны, Вероники, боясь, чтобы здесь не заподозрили живой сердечной привязанности, он целомудренно предупреждает: "Яна – выдумка маёй галавы"» *(слайд 28).*

• ***Выразнае чытанне*** *верша* "Раманс".

• ***Праслухоўванне песнi "Веранiка"*** *(верш М. Багдановiча, муз. I. Лучанка) у выкананнi ансамбля "Песняры" (слайд 29).*

**1-ы вядучы.** З успамiнаў Адама Ягоравiча Багдановiча: "Раздражался он легко, но был отходчив. Спорил с азартом, размахивал кулаками и прижимал их к груди… Всего больше интересовался вопросами национальными и литературными. Незлобив и мягок, мечтателен, с нежным, почти женственным сердцем…

Воззрений он держался прогрессивных и по убеждениям был гуманистом чистейшей воды…

В школе был хорошим товарищем… все его близко знавшие относились к нему любовно… К состоянию своего здоровья относился довольно беспечно, и за этой стороной дела приходилось пристально следить мне. Роста был высокого, хорошо сложен, но держался несколько сутуловато. Волосы имел густые, слегка волнистые, темно-русые. Глаза серые” *(слайд 30)*.

• ***Выразнае чытанне*** *верша “Халоднай ноччу я ў шырокім, цёмным полі…”*.

**2-і вядучы.** Паэзія Максіма Багдановіча прыгожая, спеўная, нацыянальная, сацыяльна значная, актуальная, класічная, вечная!

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
Паглядзі, як усход разгараецца,
Колькі ў хмарках залётных агня…

**Спіс літаратуры**

**1. Максім Багдановіч** : энцыклапедыя / склад. І. У. Саламевіч, М. В. Трус ; рэдкал. : Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011.

**2. Паэт красы і гармоніі** [Электронны рэсурс] : Да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891 – 1917) / Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Літаратурны музей М. Багдановіча ; складальнікі: Л. Г. Гушчынская [і інш.]. – Мінск : НББ, 2011. – 1 электронны аптычны дыск (DVD-ROM).

**3. Шлях паэта.** Успаміны і біяграфічныя матэрыялы пра Максіма Багдановіча. – Мінск : Маст. літ., 1975.

**Іван ГЕРАСІМОВІЧ,**
выкладчык беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
філіяла “Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж
імя акадэміка М. С. Высоцкага” ўстановы адукацыі
“Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі”.

*Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.*